# Форум МСЭ "Разумныя ўстойлівыя гарады: сацыяльныя, эканамічныя і кіраўнічыя складнікі" пройдзе з 15 па 17 лютага ў Мінску

Форум МСЭ "Разумныя ўстойлівыя гарады: сацыяльныя, эканамічныя і кіраўнічыя складнікі" пройдзе з 15 па 17 лютага ў Мінску на пляцоўцы Міжнароднага цэнтра камутацыі РУП "Белтэлекам", размешчанага па адрасе: Мінск, вул. Захарава, 55.

Форум прызначаны для прадстаўнікоў міністэрстваў і ведамстваў, рэгуляторных органаў, муніцыпалітэтаў, тэлекамунікацыйных аператараў, вышэйшых і агульнаадукацыйных навучальных устаноў, вытворцаў тэлекамунікацыйнага абсталявання, навуковых і праектных інстытутаў, распрацоўшчыкаў праграмнага забеспячэння і іншых зацікаўленых арганізацый дзяржаў-членаў, членаў сектараў і асацыіраваных членаў МСЭ.

Сумесна з форумам будуць праведзены сходы рэгіянальных груп даследчых камісій МСЭ-Т для Усходняй Еўропы, Цэнтральнай Азіі і Закаўказзя (Рэггр-ВЕЦАЗ).

Форум пройдзе ў гібрыдным фармаце (фізічны + анлайн) на рускай мове.

Форум арганізаваны Міжнародным саюзам электрасувязі сумесна з ААТ "Гіпрасувязь" і пры падтрымцы Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь

Рэгістрацыя

https://www.itu.int

**Source URL:** *https://www.xn--b1akbcqh2a7i.xn--90ais/news/31-01-2022-7703*